***А. В. Пагоцкая,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дэкан факультэта мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# СЦЭНАГРАФІЯ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРА Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ Г. І. БАРЫШАВА

Імя Гурыя Іларыёнавіча Барышава шырока вядома ў беларускім мастацтвазнаўстве як аўтара прац па гісторыі тэатральнай культуры Беларусі XVIII ст. Living Рознабаковыя навуковыя даследаванні ўключаюць працы па тэорыі і гісторыі выяўленчага мастацтва і архітэктуры, па матэрыяльна-мастацкай культуры. Працы доктара мастацтвазнаўства, прафесара Г. І. Барышава маюць вялікае значэнне ў вывучэнні гісторыі прафесійнага тэатра Беларусі, мастацка-матэрыяльнай культуры Беларусі і непасрэдна сцэнаграфіі беларускіх тэатраў.

Гурый Іларыёнавіч злучаў неверагодную працаздольнасць, востры і чэпкі розум, бязмежную памяць і ўменне рабіць бліскучыя навуковыя высновы. Скончыўшы Ташкенцкі дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва па спецыяльнасці «акцёр драматычнага тэатра», ён выступаў на сцэне драматычнага тэатра. Аднак хутка пакінуў артыстычную кар’еру, сыходзіць у навукова-даследчую працу, паступіўшы ў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР на аддзяленне тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва [3, с. 38]. Ужо ў тыя далёкія 1950-я гг. ён зацікавіўся мастацтвазнаўствам, якое пазней стане навуковай школай кампаратыўнага мастацтвазнаўства ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

З 1976 г. да апошніх дзён Гурый Іларыёнавіч выкладаў у Мінскім інстытуце культуры (зараз Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў), працуючы спачатку на пасадзе дацэнта, потым загадчыка кафедры беларускай і сусветнай айчыннай культуры, прафесара. У 1989 г. ён абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара мастацтвазнаўства па тэме «Тэатральная культура Беларусі XVIII ст.» [4] і ў 1990 г. атрымаў вучонае званне прафесара.

Кола навуковых захапленняў яго, шырокае і шматграннае, уключае вялікую колькасць работ, сярод якіх манаграфіі, кнігі, брашуры, навуковыя і навукова-папулярныя артыкулы, арты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кулы для энцыклапедый і даведнікаў, метадычныя распрацоўкі, бібліяграфічныя агляды, рэцэнзіі, біяграфічныя нарысы, уступныя артыкулы і каментарыі, навукова-інфармацыйныя нататкі і мноства іншых публікацый, што сведчыць аб інтэлектуальнай універсальнасці ведаў Барышава [6, с. 9]. Характэрнай асаблівасцю ў сферы яго даследчых захапленняў сталі сумежныя галіны культуры і мастацтва, у асноўным тэатразнаўства і мастацтвазнаўства, гісторыя і тэорыя мастацтва. Карыстаючыся прынцыпамі гістарызму як навуковага метаду даследавання, Г. І. Барышаў вывучаў беларускі тэатр з пункту гледжання канкрэтных гістарычных умоў і ў тыповых абставінах. Менавіта таму вялікая колькасць даследаванняў прысвечана вывучэнню разнастайных форм і відаў тэатральнага мастацтва. Яго працы па гісторыі батлейкі, народнай драмы, школьнага тэатра, маёнткавага тэатра насычаны факталагічным матэрыялам. Гурый Барышаў – даследчык з энцыклапедычнымі ведамі – звяртае ўвагу на ўсе бакі развіцця тэатральнага мастацтва, ад агульнага да канкрэтнага.

Цікавасць да даследавання сцэнаграфіі беларускага тэатра выявілася ў Гурыя Іларыёнавіча яшчэ падчас навучання ў аспірантуры. Ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва Беларусі (1917–1941 гг.)» [4]. Сабраныя падчас даследавання матэрыялы былі выдадзены ў альбоме «Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва Савецкай Беларусі» [2]. Затым было шмат даследаванняў, у якіх падрабязна вывучаўся рэпертуар, архітэктура збудаванняў, сцэнічная прастора школьнага, аматарскага, прыватнаўласніцкага магнацкага і камерцыйнага тэатраў на тэрыторыі Беларусі.

Як сцвярджаў Г. Барышаў, тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва ў Беларусі пачало развівацца даўно, але поўнага росквіту яно дасягнула толькі пасля 1917 г., калі ў першыя гады пасля рэвалюцыі былі створаны ўмовы для развіцця прафесіянальнага тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва, а самым лепшым, што было створана ў галіне дэкарацыйнага мастацтва Беларусі, аўтар называў дзейнасць «Першай беларускай трупы» І. Буйніцкага [2, с. 3]. Але ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. пачаўся працэс пераасэнсавання гістарычнай мастацкай спадчыны. У тэатральным мастацтве і архітэктуры найбольш ярка выявіліся тэндэнцыі збліжэння, узаемапранікнення і ўзбага-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэння розных стыляў і кірункаў. І стала зразумела, што вялікі пласт культурнага асяроддзя дарэвалюцыйных часоў чакае сваіх даследчыкаў. Напрыклад, Барышаў першым у савецкі час звярнуўся да даследавання батлейкі (у суаўтарстве з А. Саннікавым) [3, с. 38].

Сцэнаграфія ўяўляе сабой цэласны комплекс узаемазвязаных кампанентаў. Асобныя аспекты будаўніцтва сцэнаграфіі і тэатральных збудаванняў разглядаліся ў калектыўнай працы «Гісторыя беларускага тэатра» (т. 1–3, 1983–1987 гг.). У ёй утрымліваюцца звесткі пра народны, школьны, прыватнаўласніцкі тэатр, а таксама драматургію, рэпертуар, рэжысуру XIX–XX стст. Пад рэдакцыяй Г. Барышава, У. Няфёда, А. Сабалеўскага і інш. быў сабраны багаты фактычны матэрыял і гістарычныя звесткі, якія сталі нагодай для далейшых даследаванняў на сучасных навуковых падыходах і новых метадалогіях. Напрыклад, у мастацтвазнаўчым артыкуле Г. Барышава «Маёнткавыя прыгонныя тэатры» ў першым томе «Гісторыі беларускага тэатра» даецца характарыстыка дэкарацыйнай тэхнікі, сцэнічных пабудоў і прыстасаванняў, якія разам складаюць сцэнічнае афармленне тэатраў М. К. Агінскага ў Слоніме, А. Сапегі ў Ружанах, А. Тызенгаўза ў Гродне, Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку, С. Зорыча ў Шклове, Тышкевічаў у Свіслачы і Плешчаніцах і г. д. [1, с. 177–224].

У адным з буйнейшых даследаванняў тэатра Беларусі «Тэатральная культура Беларусі XVIII стагоддзя» даследчык падрабязна аналізуе асноўныя формы тэатральнага мастацтва ў Беларусі ў XVIII ст., прасочвае шляхі развіцця розных тыпаў школьнага, прыдворнага, прыватнаўласніцкага і буржуазна-камерцыйнага тэатраў, а таксама народнай тэатральнай творчасці [5]. Асаблівую ўвагу аўтар надае тэатральнаму дойлідству і дэкарацыйнаму мастацтву, якія існавалі ў XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі. Дадзены аналіз з’явіўся асновай для далейшага вывучэння тэатральнай архітэктуры і сцэнаграфіі. Даследаванне сінтэзу тэатральнай архітэктуры і сцэнаграфіі дазволіла паказаць беларускае мастацтва як частку еўрапейскай культуры і вызначыць яго самабытныя рысы. Важна было ацаніць не толькі сам гістарычны матэрыял розных відаў мастацтва, але і сродкі яго інтэрпрэтацыі ў сучаснай мастацкай культуры.

Тэатралізацыя спрыяла фарміраванню сцэнічнай культуры і выхаду сцэнічнай прасторы ў паратэатральных дзеяннях (бога-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

службовых працэсіях і свецкіх забавах) за межы тэатральнай залы (збудавання) на адкрытыя пляцоўкі. Творы тэатральнай архітэктуры і мастацтва існавалі як неад’емная частка агульнаеўрапейскай мастацкай культуры, але мелі разам з тым спецыфічныя нацыянальныя, рэгіянальныя рысы. У працах Г. Барышава падрабязна вывучаюцца асноўныя прыёмы сцэнаграфіі, выпрацаваныя ў школьных тэатрах езуіцкіх калегіумаў у Полацку, Гродне, Віцебску, Пінску, Мінску і інш. і атрымаўшыя далейшае развіццё на прыватнаўласніцкай тэатральнай сцэне Нясвіжа, Слуцка, Слоніма, Гродна і г. д. Гурый Іларыёнавіч даследуе афармленне беларускіх школьных тэатраў, заснаванае на трактатах М. К. Сарбеўскага, Ф. Ланга, Я. Масены, якое і з’яўлялася адлюстраваннем мастацкай практыкі заходнееўрапейскага тэатра.

Вучні Гурыя Іларыёнавіча працягнулі яго пачынанні ў розных галінах мастацтвазнаўства. Асаблівасці з’яўлення тэатральных прымітываў на землях Вялікага Княства Літоўскага разглядаюцца ў дысертацыйным даследаванні А. Я. Корсакавай, дзе аўтар асаблівую ўвагу надае фарміраванню сцэнічнай прасторы тэатра Ф. У. Радзівіл у Нясвіжы [7].

Непасрэдна аўтара артыкула Гурый Іларыёнавіч падштурхнуў да напісання дысертацыйнага даследавання па сцэнаграфіі беларускага тэатра [8]. Менавіта на той момант (1999) тэма здавалася актуальнай, неабходнай для таго, каб падсумаваць вынікі яго шматгадовай плённай працы. На жаль, пры жыцці Барышава здзейсніць задуму не атрымалася магчымым, але пазней абарона дысертацыі на саісканне ступені кандыдата мастацтвазнаўства адбылася пад непасрэдным навуковым кіраўніцтвам яго вучаніцы Алены Яўгенаўны Корсакавай, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта. Шмат у чым дзякуючы Гурыю Іларыёнавічу, у беларускім мастацтвазнаўстве склалася канцэпцыя шматэтнічнай і шматлінгвістычнай тэатральнай культуры, якая арганічна ўвайшла ў агульнаеўрапейскі кантэкст, але разам з тым мела і свае рэгіянальныя і нацыянальныя асаблівасці.

---

*1. Барышаў, Г. І.* Маёнткавыя прыгонныя тэатры / Г. І. Барышаў // Гісторыя беларускага тэатра. – Мінск, 1983. – Т. 1. – Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г. – С. 177–224.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Барышаў, Г. І.* Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва Савецкай Беларусі / Г. Барышаў [Выяўленчы матэрыял] : [альбом / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акад. навук. БССР, Беларус. тэатр. аб'яднанне]. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, рэд. выяўленчай прадукцыі. – 1958. – 198 с.

3. Барышев Гурий Илларионович // Современное искусство Республики Беларусь : справочник персоналий / сост.: В. П. Прокопцова [и др.]. – Минск, 2018. – С. 37–38.

4. *Барышев, Г. И.* Театрально-декорационное искусство Белоруссии (1917–1941 гг.) : автореф. дис. … канд. искусствоведения / Г. И. Барышев ; АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : [б. и.], 1958. – 14 с.

5. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с. : ил.

6. *Голикова, Л. Ф.* Ученый. Педагог. Драматург. Театральный и общественный деятель // Гурый Іларыёнавіч Барышаў: бібліягр. паказ. / Беларус. ун-т культуры ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, Л. І. Доўнар, І. П. Кажура ; рэд. Т. А. Самайлюк. – Мінск, 1998. – С. 6–15.

7. *Корсакова, Е. Е.* Феномен «художественного примитива» в пластическом и театральном искусстве Беларуси (XVI–XVIII вв.) : автореф. дис. … канд. искусствоведения : 17.00.09 / Е. Е. Корсакова ; Белорус. гос. ун-т культуры. – Минск, 2001. – 20 с.

8. *Пагоцкая, А. В.* Мастацка-стылявая эвалюцыя сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у Беларусі к. XVI – пач. XX ст. : аўтарэф. дыс. … канд. мастацтвазнаўства : 17.00.09 / А. В. Пагоцкая ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2019. – 28 с.

***Ю. Г. Балодис,***
*кандидат культурологии, доцент,*
*доцент кафедры менеджмента социально-культурной деятельности*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# МОДЕРНИСТСКИЕ ТЕНДЕНЦИИ В РАЗВИТИИ ЖИЛОЙ АРХИТЕКТУРЫ (1950–1970): МИРОВОЙ И СОВЕТСКИЙ ОПЫТ

Модернизм (лат. modernus – недавний, новый, современный) мы понимаем как мироощущение и стиль искусства XX в. (1920–1970), связанные с признанием «нового» как суперценности и его перспективности. Принадлежность к модернизму определяется своеобразными установками авторов по отношению к прошлому, настоящему и будущему и характеризуется

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ